Югася КАЛЯДА

JE SUIS TON ANGE GARDIEN[1]

Югася Каляда нарадзілася 10 лютага 1981 года ў Гомелі. Жыве ў Мінску. Па адукацыі гісторык і юрыст. Працуе ў галіне рэкламнага бізнесу. Яе кнігу «Галоўная памылка Афанасія» (2005) філосаф Ігар Бабкоў назваў «самым скандальным і контраверсійным літдэбютам дзесяцігоддзя». Творы Югасі друкаваліся на польскай, літоўскай, украінскай, рускай мовах.

Не стану ждать
твоих ответов, ангел, поелику
столь плохо представляемому лику,
как ты, под стать,
должно быть, лишь
молчанье — столь просторное, что эха
в нём не сподобятся ни всплески смеха,
ни вопль «Услышь!»

Іосіф БРОДСКІ

I

Пасярод аднаго з занядбаных завулкаў, што месціўся ў аддаленым гарадскім квартале, на пыльнай дарозе, аточанай паабапал старымі платамі, старымі дрэвамі ды старымі дамамі, стаяў, прыклаўшы руку брылём да твару, малады хлопец у джынсах ды клятчастай кашулі.

Быў толькі пачатак жніўня, той самы час, калі лета ўваходзіць у сваю найлепшую пару. Нашае непрацяглае лета, нібы авансам на доўгія зімовыя месяцы, на пачатку жніўня залівае гарады сонцам і лянотнай гарачынёй; тады ўсё гарадское жыхарства, прадчуваючы хуткае трымценне пад халоднымі вятрамі, нерухомее пад гэтым сонцам, заплюшчвае вочы і скараецца панаванню гарачыні.

Напоўніцу гарадскую летнюю летаргію можна адчуць толькі ў такіх занядбаных кварталах. Згаданы завулак нібы ўвасабляў сабою сон і нерухомасць. І не было адкуль узяцца ветрыку, які зрушыў бы гарачы жоўты пыл на дарозе, расцярушыў бы хмызы, што скрозь абляплялі платы, а дзе-нідзе нават запаўнялі сабой праломы; і старыя сады, што месціліся ў глыбінях двароў, надзейна ахоўвалі густы выратавальны цень пад сваім галлём. Толькі што даносіўся аднекуль раз-пораз кароткі брэх зморанага сабакі, ды маленькія птушкі былі пачыналі цвыркаць, але хутка змаўкалі. Увесь завулак выглядаў так, нібыта рыхтаваўся да паміранння, не стрываўшы націску часу; здавалася, тыцні нагой любы з гэтых дамоў — і рассыплецца ў пясок уся вуліца, пакінуўшы па сабе адно горкі прысмак пылу ў роце ды такі самы горкі ўспамін.

---

[1] Я твой анёл-абаронца (*фр.*).

Завулак менаваўся Камуністычным, што вынікала з аблупленай сіняй шыльды, ды, пэўна, адным сваім выглядам ілюстраваў цэлы гістарычны перыяд, маючы на мэце даць навуку будучым пакаленням.

Хлопец, які ўтаропіўся ў адзін з дамоў завулка, пацёр шыю пад вузкім раменьчыкам важкага фотаапарата, які ўжо добра намуляў яму. Хлопца звалі Колем, Міколам; ён меў дваццаць чатыры гады, позірк разумнага чалавека ды пульхныя вусны, якія, хоць і не псавалі ягонага твару, але надавалі яму нейкае падабенства да дзіцяці, асабліва на зыркім святле. Ён, мабыць, даўно прызвычаіўся да гэтае адметнасці свайго твару, таму па звычцы, каб выглядаць адпаведна веку, ссоўваў бровы ды хмурыў лоб. Нават цяпер, пры адсутнасці гледачоў, Міколаў твар выдаваў гэтую міміку, бо Мікола шукаў адказ на вельмі значнае пытанне.

— Не, не бачыў... Або бачыў? Не, не можа быць!

Ён звяртаўся з гэтаю прамоваю да старога дома нумар шэсць два. Дом аслупянела глядзеў на навакольны свет пустымі прагаламі вокнаў усіх сваіх трох паверхаў. Чырвоная фарба фасада сто гадоў як аблупілася: яна адвальвалася ад сценаў разам з вялікімі кавалкамі тынку, агаляючы крохкую, калісьці чырвоную, цэглу. З правага боку дом быў спрэс аплецены вінаградам, і здавалася, што толькі дзякуючы гэтай адважнай расліне пакуль яшчэ не развальваецца.

Такія вось старыя дамы былі аб'ектам Міколавых даследаванняў. Справа ў тым, што Міколка паляваў на гісторыю. Старыя газеты, дзённікі, сшыткі, фотаздымкі, паштоўкі, лісты, — усё гэтае смецце, кінутае колішнімі гаспадарамі, гэтыя сведкі гісторыі — усё гэта месцілася на гарышчах старых дамоў. Кожны, хто больш ці менш шчыльна судакранаўся з навукай Гісторыяй, ведае найвялікшую мару археолага — патрапіць на старажытны сметнік. Такім чынам недасягальны Уладар Час ператварае смецце ў каштоўнасці.

Коля быў гісторыкам паводле адукацыі ды закліку душы. Ужо на першым курсе ён зразумеў, што ягоная мара капаць у Даліне Фараонаў гэтак марай і застанецца, таму ён вырашыў праводзіць раскопкі, якія не вымагаюць ніякіх адкрытых лістоў. Мабыць, ён і парушаў нейкі закон, але пакуль ніхто не прыйшоў па ніводны з ягоных скарбаў.

І вось цяпер Мікола стаяў перад гэтым домам нумар шэсць два ў Камуністычным завулку ды спрабаваў зразумець: чаму ён раней яго не прыкмячаў?

Так і не знайшоўшы адказу, Мікола пастанавіў, што іншых перашкод даследаванням няма, ды, папярэдне акінуўшы вокам завулак, рушыў абыходзіць дом, каб увайсці ў дзверы, што месціліся з боку двара.

Дзверы аказаліся там, дзе ён і меркаваў; дакладней, саміх дзвярэй не было, адно толькі прагал, які адкрываў стромкія сходы ў вантробах двара. Дом будаваўся з разлікам на некалькі кватэр.

— Кватэры — потым! — пастанавіў Коля ды рушыў адразу на гарышча, узрадаваны тым фактам, што сходы былі цэлыя ды не абваліліся пад цяжарам часу.

А гарышча аказалася менавіта такім, якімі і мусяць быць гарышчы старых занядбаных дамоў. Там панаваў дзіўнаваты пах, уласцівы апусцелым памяшканням, даволі прыемны пах — з тых, што спрыяюць настальгіі ды шалёнай юнацкай рамантыцы. Паветра пад дахам, нагрэтае да гарачыні, было шматкроць прарэзана вертыкальнымі сонечнымі слупамі — там, дзе стары бляшаны дах меў пашкоджанні, і шырокі сонечны прамень праклаў сабе шлях упоперак гарышча — ад аднаго акенца да другога.

Карацей, гарышча было выдатнае. Толькі абсалютна пустое.

Так, абсалютна, неймаверна пустое — нават на дашчанай падлозе не валялася ніякага бруду, будаўнічага смецця — нібы нехта акуратна ўсё падмёў. Напэўна, былыя гаспадары і самі належалі да таварыства архіварыусаў ды знеслі па ад’ездзе ўсе дакументы, а заадно і прыбралі па сабе.

— Ну нічога сабе! — вымавіў невымоўна здзіўлены Мікола.

Такога ён, напраўдзе, яшчэ ніколі не спатыкаў.

Ён ужо скіраваўся да выхада, маючы слабую надзею хоць нешта знайсці ў кватэрах, як раптам заўважыў у куце цьмяны бляск амальгамы.

Коля асцярожна, не давяраючы свайму шчасцю, зрабіў колькі крокаў у самы аддалены ды змрочны закутак гарышча, куды не сягаў ніводны сонечны праменьчык. Там, спрэс аплеценае павуціннем, стаяла вялікае, вышэй за чалавечы рост, люстра.

Гэтае люстра нібы наўмысна пакінулі тут. Коля беражліва сабраў з яго павуціннe; відаць, люстра прастаяла некранутае не адзін год: з-пад пальцаў разбягаліся павукі розных памераў ды ўзростаў, сыпаліся пустыя мушыныя абалонкі, матыльковыя крылцы ды абвальваўся зляжалы шмаццём пыл. Коля ачысціў люстра ды абамлеў.

Вось чаго ён не бачыў дык не бачыў! Ён нават не зразумеў, да якой эпохі належыць люстра ды з якой краіны яно прыехала. Асада была шырокая, пэўна, драўляная, але шчыльна пакрытая золатам — не пафарбаваная залатою фарбаю, а менавіта пакрытая нечым незвычайным, бо гэтае золата не лупілася, а толькі набыло з часам дзіўнаватыя адценні. Ды і сам арнамент, выяўлены на асадзе, таксама быў неперадавальна дзіўны. Мікола, які да гэтага моманту лічыў сябе знаўцам гісторыі, ашаломлена кратаў гэтых пачвар: ці то людзей, ці то птушак, ці то ільвоў, — ды ніяк не мог зразумець, што гэта за дзіўны стыль. Натуральна, што да такой шалёнай эклектыкі маглі дайсці толькі сучасныя творцы — а ў некаторых паставах вычварна пераплеценых целаў нават адчуваліся намёкі на егіпецкі канон! — але Мікола вельмі не хацеў вось так адразу ды канчаткова расчароўваць сябе. І нешта яму падказвала, проста няспынна спявала ўвушшу: «Не, не, не! Не, гэта не сучаснасць! Гэта — таямніца, сакрэт, найвялікшая загадка, містыка!» І нават амальгама — о, гэтая недасягальная, таямнічая амальгама! — нават яна была *не такая*, нязвыклая ды дзіўная: занадта глыбокая, занадта цьмяная для амальгамы сучаснага люстра. Нягледзячы на меркаваную старажытнасць, яно цудоўна адлюстроўвала і гарышча з сонечнымі слупамі, і самога Міколу, і абяцала, як апошняму здавалася, адлюстраваць яшчэ шмат чаго — або раскрыць таямніцу свайго паходжання.

— Не, гэта нельга тут пакідаць! — рашуча пастанавіў зачараваны Мікола; ён абхапіў, каб несці, люстра ды адразу натрапіў рукамі на новую павучыную калонію. Давялося ачышчаць адваротны бок знойдзенай каштоўнасці.

Не знайшоўшы ззаду ані подпісаў, ані прыклееных паперак, Коля, тым не менш, ані трохі не страціў надзеі; ён забыўся на так і не даследаваныя кватэры ды пацягнуў люстра да сходаў, мяркуючы, як лацвей гэта зрабіць.

А перасоўванне люстра насамрэч было праблемай. Важкае, вялікае, яно не паддавалася, толькі і чакала, каб выслізнуць з Міколавых абдымкаў, нібыта не хацела развітвацца з гарышчам і домам. Мікола падцягнуў яго да адтуліны ў падлозе; прытрымліваючы люстра аберуч, ён толькі хацеў спусціць яго за сабою, як левая нага згубіла прыступку. Разам з гэтым і сам Мікола страціў раўнавагу. У гэтым не было б нічога жахлівага, але Міколавы задзёртыя дагары рукі рэфлекторна выпусцілі люстра. Разумеючы, што зараз гэтая махіна абрынецца на яго ўсёю вагою, Мікола адзінае, што паспеў, прыкрыў галаву рукамі.

* * *

Мікола расплюшчыў вочы ды зразумеў, што мог бы і не рабіць гэтага. Навокал стаяла непраглядная цямрэча. Хлопец адчуў, што ляжыць перакулены ў вельмі дзіўнай паставе на нечым мяккім. Ён асцярожна, па чарзе паварушыў рукамі, нагамі, галавой: нідзе не балела.

Цемра тым часам крыху рассоўвалася. Мікола ўскочыў на ногі, абмацаў сябе ды паднёс рукі да вачэй. Да ягоных далоняў прыклеіліся кавалачкі моху, зямлі ды доўгія хваёвыя голкі.

— Ёлкі-палкі! — абалдзела сказаў Мікола. — Ёлкі-палкі!!!

Насамрэч, ён меў рацыю. Навокал і палак, і елак было ўдосталь. Мікола быў у начным лесе, у самым гушчары.

Непраглядная хвіліну таму цемрадзь умомант набыла мільёны розных адценняў ды абрысаў. Нізка-нізка, ледзь не чапляючы вершаліны елак, па нябёсах плыла вялікая белая поўня.

— А! Дык я папросту праваліўся ў люстра, — здагадаўся Мікола, — і апынуўся ў лесе! Усё зразумела!

І што яму было зразумела?

Пра што можа думаць чалавек, які знайшоў у раней ніколі не бачаным доме таямнічае люстра, праваліўся ў яго ды апынуўся пасярод начнога лесу? Напэўна, ён канчаткова і незваротна звар'яцеў! Добра, адкінем гэтую гісторыю з люстрам. Пра што можа думаць нармальны, здаровы чалавек, які раптам апынуўся адзін у начным гушчары? Спачатку, мабыць: «Ой, мамачкі родныя! Божухна, дапамажы мне!» А потым, суцішыўшы трымценне пад каленкамі ды калаценне сэрца, пачне больш ці менш цвяроза разважаць: шукаць, з якога боку дрэвы парослыя мохам, залезці на высокую елку або хвою, вырашыць, урэшце, прычакаць світанку!

Ніводнай з вышэйзгаданых думак у Міколы не нарадзілася. Ён нават не засмуціўся з нагоды згубы новага ды надта дарагога фотаапарата — наадварот, адчуў палёгку ад таго, што нічога больш не боўтаецца на шыі. Ён пайшоў наперад — менавіта туды, куды глядзелі ягоныя вочы.

Мікола ішоў сабе наперад, раз-пораз адхіляючыся ад зарасніка невядома чаго. Ён ішоў, абсалютна спакойны, і радаваўся таму, што вось рушыць ён, вольны, шчаслівы чалавек па лесе, і паветра такое свежае, і так прыемна пахне хвоя, і да таго ж вялікая поўня асвятляе ягоны шлях. Ні «А дзе мой дом?», ні «А што я буду есці заўтра?», ні нават «А куды я іду?» — ніводнае з гэтых пытанняў не турбавала цяпер Міколу. Ён рухаўся наперад ды адчуваў асалоду ад свабоды ды еднасці з прыродай.

Так вось ішоў Мікола, пакуль не натрапіў вачыма на маленькі агеньчык, што цёплым жоўтым святлом міргаў недзе далёка між дрэў.

— О! Вось туды я і пайду! — узрадваўся Мікола.

Ён нават не падумаў, што агеньчык можа вырасці ў вогнішча, раскладзенае нядобрымі людзьмі; што святло, мабыць, папярэджвае пра небяспеку — не, куды там! Мікола паляцеў на святло як даверлівы матылёк.

Агеньчык не знікаў, наадварот, ён павялічваўся, святлеў ды, праз нейкую гадзіну, ператварыўся ў цёпла асветленае акно нейкай драўлянай хаціны, што стаяла ў лясным прагале.

Мікола выйшаў з лесу ды спыніўся. Хатка была дзіўная. Па-першае, яе з аднаго боку атачаў частакол, на якім зверху было нешта паначапляна, белае ды круглае; у няпэўным святле поўні Мікола не ўгледзеў, што менавіта. Па-другое, хатка, хаця і месцілася далёка ад ракі, але была збудавана на даволі высокіх слупах, прычым

слупы былі размешчаны шалёным архітэктарам не на рагах пабудовы, а толькі пасярэдзіне. Дзвярэй відаць не было.

— А!.. — здагадаўся Мікола. — Хатка, як цябе, ну, таго... Абярніся! Да лесу задам!..

Ніякіх змен не адбылося. Хата засталася стаяць, як стаяла.

— А да мяне перадам! — дадаў Мікола.

І зноў нічога.

Мікола ўжо быў набраў паветра ў лёгкія, каб з усяе моцы яшчэ раз пракрычаць замову, як раптам у лясной цішы прагучаў рашучы жаночы голас.

— Абыходзь!

— Чаго? — не зразумеў Мікола.

— Абыходзь, я кажу! Хату абыходзь! Ты ж увайсці хочаш, дзверы тут!

Мікола паслухмяна рушыў туды, адкуль даносіўся голас. З іншага боку хаткі на даволі высокім ганку сядзела, склаўшы ногі па-турэцку, жанчына, якая зацягвала вяроўкай вялікую мяцёлку. Не падымаючы галавы, яна працягнула:

— Падымайся, чаго стаў? Вось бачыш, усё зламанае спрэс, і хата зламаная, а парамантаваць рукі не даходзяць! Вось і мяцёлка была развалілася!

Жанчына завязала апошні вузел, праверыла, ці моцна зацягнута вяроўка, ды, закончыўшы работу, паднялася і зірнула ў вочы Міколы, які ўжо спрытна ўскараскаўся па драбінах на ганак.

— Ну, добры вечар, хлопец! — і яна падала руку для вітання.

— Добры вечар! — Мікола пацiснуў працягнутую яму цвёрдую руку ды спытаў:

— А вы — Баба Яга?

Жанчына весела засмяялася, паказаўшы роўныя белыя зубы.

— Ну так, так! Калі хочаш, буду Баба Яга. Хадзем у хату, халодна ўжо. Змерзла ўся, пакуль цябе чакала.

І Баба Яга шырока адкрыла дзверы, на некалькі секундаў заліўшы святлом начынне двара разам з частаколам і насаджанымі на яго чалавечымі чарапамі. Мікола, які прапусціў Ягу першай, зірнуў, ці не ідзе яшчэ нехта, ды шчыльна зачыніў за сабой дзверы.

У хаце было светла, цёпла ды ўтульна. Мікола апусціўся на лаўку ды адразу адчуў, наколькі ён стомлены.

Хата складалася з аднаго, але даволі вялікага пакоя без усялякіх сенцаў. Пасярод стаяў вялікі стол з лаўкамі, ля правай сцяны тулілася неверагодных памераў печка. Ля печкі меліся паліцы з разнастайным кухонным начыннем. Рэшта прасторы сценаў была адведзена кнігам. Кніжныя паліцы раслі ад падлогі ды сягалі ажно высокай столі. І ўся хата была асветлена цёплым святлом свечак, расстаўленых паўсюль у розных дзіўных жырандолях.

Баба Яга адразу знікла недзе за печкаю ды загрымела там посудам. Раптам яна вярнулася і ўтаропілася ў Міколку, упёршы рукі ў бакі:

— Слухай! Ну чаго ты сеў? Хуценька мыцца ды спаць! Ужо, пэўна, трэцяя гадзіна — так мы і світанак сустрэнем!

— А мыцца ў лазні? — пацікавіўся Міколка.

— Ха! А дзе ты тут лазню бачыў? Ой, кніжак абчытаўся! Хадзем, пакажу.

Баба Яга завяла Міколку за печку; там былі пастаўлены розныя тазікі з вадой ды кошыкі.

— Ну, я думаю, тлумачыць табе не трэба... А, вось яшчэ. Так, ручнікі чыстыя... Кашулю вось гэтую апранеш, — яна паказала Міколку на нейкі доўгі балахон. — Сваю вопратку кінеш на падлогу, я яе заўтра спалю... Так... Ну ўсё, здаецца!

І Баба Яга пайшла, захінуўшы закуток фіранкай, замацаванай на адмыслова працягнутай вяроўцы.

Мікола, пакінуты адзін, яшчэ раз упэўніўся, ці шчыльна захінута фіранка. З тазікамі ды кошыкамі ён управіўся спрытна ды хутка, бо недарэмна нарадзіўся ў Савецкім Саюзе, дзе такое экстрэмальнае мыццё практыкавалася кожнае лета. Ды і цяпер практыкуецца на постсавецкай прасторы, дзе адключэнне гарачай вады, гэткае дзікунства на еўрапейскі погляд, увайшло ў добрую нацыянальную традыцыю.

Нарэшце Міколка, вымыты ды пераапрануты ў балахон, выйшаў да Бабы Ягі. Тая сядзела за сталом і пры святле свечкі ўважліва вывучала вялікую кнігу.

Яга падняла на яго вочы.

— Ну што, спаць?

— А есці? Я есці хачу! — яшчэ крыху, і Мікола пачаў бы клікаць яе «мамай».

— Ой, дзіцё ты горкае, — уздыхнула Баба Яга, — шкодна на ноч есці!

Яна ўсё ж паднялася ды нешта знайшла на сваёй кухні.

— На, пагрызі!

Міколка ўзяў піражок ды ўмомант праглынуў яго.

Баба Яга ўжо хадзіла па хаце ды гасіла свечкі.

— Там, на лаўцы, падушка ды коўдра... Дабранач! — і яна падзьмула на апошнюю свечку.

Міколка навобмацак знайшоў свой так званы ложак.

— А ці не будзе тут мулка? — быў спытаў ён, але, ледзь крануўшы шчакой падушку, праваліўся ў сон.

Калі Мікола прачнуўся, было ўжо далёка за полудзень. Пры дзённым святле хата выглядала яшчэ больш утульнай, чым учора ўначы: усё было такое чыстае, дагледжанае і нават на кніжных паліцах не заўважалася пылу.

Мікола хуценька ўскочыў з лаўкі. У хаце, апрача яго, нікога не было; толькі звінеў птушынымі спевамі блізкі лес ды ў двары нехта плёскаў вадою. Мікола выйшаў на ганак, які лепш было б назваць гаўбцом, настолькі высока ён быў над зямлёю, пацягнуўся, падставіўшы твар сонцу, ды адразу пачуў вітанне Бабы Ягі:

— Ну нарэшце, прачнуўся! А я ўжо будзіць цябе хацела! Нас яшчэ чакаюць сёння вялікія справы.

Баба Яга мыла на двары нейкую бялізну. Нават цяпер, на сонечным святле, Мікола ўзіраўся ў яе твар ды не мог зразумець, колькі ёй гадоў. Можа, сто, а можа, трыста. Але Баба Яга рухалася гэтак жвава ды спрытна, што немагчыма было ёй даць больш за пяцьдзясят. А калі смяялася — дык увогуле, трыццаць пяць—трыццаць. Дзіўная яна была, гэтая Баба Яга, дзіўная, як і ўсё навокал, дзіўная, як сам Мікола, які ўпарта не заўважаў гэтых дзівосаў.

Баба Яга кінула сваю бялізну ды палезла па драбінах у хату.

— Ну што, — заклапочана адзначыла яна, — вось засмажу я цябе, і будзе ў мяне свежае чалавечае мяса! — і яны з Міколам засмяяліся з трапнага жарту.

У хаце Мікола сеў пры стале ды падрыхтаваўся ўважліва слухаць. Баба Яга ўзяла з паліцы важкі фаліянт, той самы, што гартала ўночы. Яна сур’ёзна, без усялякай усмешкі, зазірнула ў Міколавы вочы.

— Слухай мяне ўважліва. Ты, напэўна, ужо здагадаўся, што трапіў у казку. Мы тут жывём, і ў нас свае законы. Ты ўжо не чалавек, але пакуль яшчэ і не казачны герой. І зараз ты мусіш зрабіць выбар — абраць сабе ролю. Ну і ўсё, што да яе дадаецца. Так... Але спачатку мы зменім табе імя. Імя — гэта ўжо палова справы, гэта ж казка, ты, спадзяюся, разумееш. Ну што гэта за імя такое — Мікола! Уяўляеш, што

ты за ролю мецьмеш з такім імем! Міколка-паравоз хіба што... Але не будзем далёка хадзіць, далёка шукаць... Ты цяпер Ніко. Сцісла і ясна. Пярэчанні не прымаюцца! — Баба Яга павяла рукою ў бок хлопца, які ўжо адкрыў рот, каб нешта вымавіць.

— Так... Ніко, значыцца. А зараз звернемся да нашай энцыклапедыі, — Яга разгарнула кнігу пасярэдзіне.

— Вось, усё што заўгодна, і нават звыш таго! Абірай. Калі ласка, напрыклад... О! Рыцар. Заўсёды на кані, з дзідаю. Мусіць скакаць па лясох ды палёх, змагацца, выратоўваць каралёў з каралеўнамі, абіраць панну сэрца, выступаць на турнірах... Ну, нішто сабе. Так, вось яшчэ. Ваўкалак. Шчыра раю. Шмат якія слаўныя людзі былі ваўкалакамі. Трэба кіраваць каралеўствам якім-небудзь або княствам, уночы перакідвацца ў ваўка, бегчы па лесе, выкрываць ворагаў... А калі раптам ворагі ўсё ж запалоняць, можна бесперашкодна ўцячы... Карацей, каб стацца ваўкалакам, трэба быць вельмі мужным. Далей. Вурдалакі. Вампірчыкі, калі хочаш. О, тут можна быць кім заўгодна! Лепш за ўсё жыць у змрочным замку — у самоце, натуральна! — быць такім прыгажунчыкам з белым тварам, уночы запрашаць дзяўчат ды смактаць кроў. Можа здарыцца няшчаснае каханне... Ну, думаю, ты і сам пра іх ведаеш. Так, яшчэ тут ведзьмакі розныя, героі, русалкі... А, ты ж у нас хлопец, даруй!

— А анёлы там ёсць? То бок тут... у нас? — пацікавіўся вельмі заінтрыгаваны Ніко.

— Анёлы, гм... Ну, натуральна, ёсць анёлы, вось, на першай старонцы! — Баба Яга падсунула Ніко разгорнуты фаліянт з апісаннем ды ілюстрацыяй.

Той колькі хвілін зачаравана вывучаў кнігу.

— А калі б я быў анёлам, — спытаў замілаваны Ніко, — у мяне таксама былі б крылы?

— Натуральна!

— І я на іх лётаў бы? Сапраўдныя крылы?

— Сапраўдныя! І лётаць можна. Трэба лётаць!

— О! — Ніко ўздыхнуў, глыбока ўзрушаны. — А хто там яшчэ ёсць?

— А ты ўжо абраў! — Баба Яга ўсміхнулася ды падміргнула яму.

— Што значыцца абраў? — запярэчыў Ніко. — Я ж яшчэ іншых не бачыў! А можа, я рыцарам быць хачу? Або каралём!

— Ты падумай, — разважліва сказала Баба Яга, — ты ўяві, які з цябе рыцар. Уяві!

Ніко заплюшчыў вочы ды пачаў засяроджана ўяўляць. Вось ён, рыцар, скача па лесе на кані, уцякае ад пагоні, а тут яму вораг насустрач, пачынаецца двубой, трэба абараняцца... Не, лепш назіраць двубоі з вышыні! Ніко шчасліва ўсміхнуўся ды расплюшчыў вочы.

Баба Яга таксама ўсміхалася.

— Ну як — анёл?

— Анёл! А дзе мае крылы?

— А ты зірні за спіну!

Ніко азірнуўся ды пабачыў вялізныя белыя крылы, што раслі з ягонае спіны. Недасведчаны пакуль, ён адразу спалохаўся: а як ён здолее кіраваць імі? Вось, напрыклад, што рабіць, калі ён захоча паварушыць правым крылом?

І адначасова з гэтаю думкаю правае крыло ледзь варухнулася. Узрадаваны Ніко працягнуў эксперымент ды так махнуў крыламі, што па хаце паляцелі пух ды пер’е.

— Эй, анёл, цішэй! Не ў нябёсах! — прыкрыкнула Баба Яга.

— Слухай... — зачараваны Ніко ніяк не мог адвесці вачэй ад сваіх крылаў, — а як, адкуль яны ў мяне з’явіліся?

— Крылы? Яны ў цябе заўсёды былі! — Баба Яга ўжо прыбрала кнігу на паліцу. — Табе ўжо час ляцець.

— Чакай! Як ляцець? Куды ляцець? — Ніко разгублена зірнуў на Ягу. — Я ж нічога тут не ведаю! Ты ж мне не патлумачыла, што мусяць рабіць анёлы!

— А нічога. Нічога не мусяць рабіць. Ды і што яны могуць? Анёлы павінны лётаць у нябёсах, а людзі мусяць заўважаць іх ды радавацца. Вось і ўсё! Ну яшчэ можна зрабіцца анёлам-абаронцам, але гэта вельмі адказна. Тут, ведаеш, хоць і казка, але ў ёй таксама свае законы.

— А які закон найгалаўнейшы? Такі, ну... Самы-самы!

— Галоўнае — гэта быць шчырым. Хадзем.

Ніко з Бабай Ягою выйшлі з хаты ды сталі на высокім ганку. Сонца ўжо пачынала пакрысе хіліцца да далягляду.

— Калі ў цябе з’явяцца невырашальныя пытанні — прылятай. Я дапамагу. Ну, а цяпер... Ляці, мой анёл! Ляці! Будзь шчыры!

Ніко шырока раскінуў крылы, зрабіў адзін узмах... другі... трэці... І раптам адарваўся ад зямлі ды памкнуўся ўгару, спачатку павольна, потым хутчэй, хутчэй, усё вышэй ды вышэй, у блакітныя-блакітныя нябёсы...

— Лячу! Я лячу! — закрычаў Ніко, але ніхто, апрача ветру, не пачуў ягоных слоў. Хатка Бабы Ягі спачатку зрабілася маленькаю-маленькаю, потым увогуле знікла з вачэй. Пад крыламі анёла Ніко ва ўсе бакі раскінуўся лес; зямля нарэшце набыла круглую форму, адкрыла анёлу свой сапраўдны твар, невымоўна прыгожае аблічча планеты...

— Я лячу! Лячу! — крычаў Ніко ды ляцеў — немаведама куды, шчаслівы, вольны анёл — проста ляцеў.

Неўзабаве ён зразумеў, што, каб ляцець, неабавязкова хлопаць крыламі, як верабей, можна проста раскінуць іх і такім чынам трымацца ў паветры. Больш за тое, можна было нават не варушыць крыламі. Ніко адчуваў, што ляціць проста так, сам па сабе, нібыта лёгкае белае пёрка, падхопленае ветрам. Так, ягоны палёт кіраваўся ягонымі думкамі.

— О-о-о! Вось гэта — шчасце! — крычаў у найвышэйшым захапленні Ніко ды ляцеў, ляцеў... Ён, выпрабоўваючы свае сілы, рэзка мяняў кірунак, перакручваўся ў паветры, перакульваўся на спіну ды лавіў крыламі моцную хвалю ветру, даваў нырца ды, не далятаючы да зямлі, адразу хутка ўзмываў угару.

А Сонца тым часам афарбавалася ў барвовы колер ды разліло чырвань па нябёсах, абвяшчаючы хуткі надыход ночы. Ніко, ужо досыць змораны, але вельмі шчаслівы, вырашыў прыпыніць свае практыкаванні ды засяродзіцца на вывучэнні лесу, адным з жыхароў якога ён цяпер стаўся.

Чамусьці ў ягонай галаве замацавалася думка, што ў лесе мусяць жыць залатыя цмокі. Адкуль ды калі з’явілася гэтая ўпэўненасць, Ніко не ведаў, але настолькі яскрава, настолькі падрабязна ўяўляў гэтых цмакоў, нібыта раней сутыкаўся з імі.

Залатыя цмокі — яны мусілі жыць у глыбокіх пячорах, на берагах лясных азёраў, вялікіх, чорных лясных азёраў, аточаных стагадовымі ялінамі. Можна было б стаіцца на пяску, у камянях ды чакаць, не адрываючы вачэй ад чорнае воднае паверхні, і ўночы пабачыць іх! Пабачыць цмачыху з цмачанятамі, маленькімі ды жвавымі, якія выходзілі б са сваёй патаемнай пячоры; можна было б назіраць, як урачыста плыве па возеры стары вялікі цмок, як ззяе ягоная залатая луска пры святле маўклівай поўні... Залатыя цмокі былі марай, затоенай марай ягонага дзяцінства, і Ніко вырашыў іх знайсці: проста так, паглядзець.

Справа была ў тым, што Ніко не меў ніякага ўяўлення, дзе шукаць цмокаў. Таму ён усклаў адказнасць за гэтую сустрэчу на свой казачны лёс ды папросту павольна паляцеў над самым лесам, ледзь не чапляючы вяршаліны елак.

Ляцеў ён даволі доўга, напружваючы зрок, але не сустрэў не тое што цмока, але нават якой-небудзь птушкі. Тым часам Сонца закацілася, саступаючы месца Месяцу, і на лес няўхільна пачала навальвацца цемра.

— Ну што гэта такое! — расчаравана працягнуў Ніко. — Я лячу ўжо каторую гадзіну, а ўсё яшчэ ні на каго не натрапіў! Я што, тут адзін, у гэтай казцы?

І адразу заўважыў залаты бляск унізе, пад дрэвамі.

Гэтая маленькая падзея ў чарговы раз пацвярджае старую ісціну: не трэба хаваць сваіх жаданняў! Вар'яцкія, неверагодныя, містычныя, абсурдныя — усе жаданні трэба выказваць гучна ды фармуляваць канкрэтна.

Залаты бляск, між тым, належаў далёка не цмоку; ён сыходзіў ад доўгіх залатых валасоў дзяўчыны, якая блукала па лесе ў такую досыць познюю гадзіну. Ну і не мусіла яна быць залатым цмокам: Ніко ж не паведаміў, каго менавіта ён хоча сустрэць!

Ніко ані трохі не засмуціла гэткае несупадзенне; наадварот, ён быў узрадаваны, і яшчэ як! Ну напраўду, у першы ж дзень свайго казачнага жыцця сустрэць у лесе дзяўчыну з залатымі валасамі! Ніко, пакуль ляцеў ёй на дапамогу, — а ён чамусьці адразу вырашыў, што дзяўчыне трэба дапамагчы, — ужо аплёў сябе вясёлкавым павуціннем ілюзій. «Ну натуральна, — думаў Ніко, — гэта ж каралеўна! Адзіная дачка тутэйшага караля. Пайшла без аховы збіраць кветачкі ды заблукала ў лесе! А я цяпер вярну яе ў сям'ю, якая, пэўна, ужо падняла на ногі ўсё каралеўства! Вось як яно проста! Ні рыцарам не трэба быць, ні вампірам, — ні табе двубояў, ні крыві! Палётаў, палётаў — і герой! Лепш за ўсё быць анёлам. І не трэба мне паловы вашага каралеўства!»

Дзяўчына пачула ў небе рух ды падняла вочы. Ніко сустрэўся з ёй позіркам ды, шчаслівы, пачаў спускацца на зямлю. Ён вельмі шкадаваў, што не можа бачыць сябе збоку. Якая ўсё ж гэта была кранальная сцэна! Дзяўчына, што падняла вочы да неба, і гэты залаты вадаспад валасоў, яна была такая далікатная, безабаронная, у доўгай белай сукенцы — пасярод вечаровага лесу, зусім адна — яна сама выдавала на анёла, такая светлая, гнуткая, як кветачка!.. Ніко і думаць забыўся на сваіх цмокаў. Ён апусціўся перад дзяўчынай, апошні раз узмахнуўшы крыламі ды працягнуў ёй рукі.

— Добры вечар!

— Добры вечар! — дзяўчына мякка ўклала свае далоні ў ягоныя.

Яна глядзела на Ніко так даверліва, так сур'ёзна; мабыць, дзяўчына цяпер адорвала яго найглыбейшым позіркам, спрабуючы выказаць вачыма патаемную мару свайго сэрца. Гэта было так безразважна, так неабачліва — адорваць выпадкова сустрэтага ў лесе такім позіркам, але як можна не давяраць анёлу? Як можна чакаць прыхаванай небяспекі ад таго, хто спусціўся да цябе з нябёсаў? Ад таго, хто гэтаксама шчыра зазірае табе ў вочы?

Дзяўчына не ўсміхалася; наадварот, ейны твар захоўваў засяроджаную сур'ёзнасць, але дзякуючы гэтаму позірку-малітве, дзякуючы маленькім цёплым далоням, што дзяўчына даручыла ягонай уладзе, Ніко зразумеў: ён прыляцеў своечасова. Яшчэ б нейкія паўгадзіны — і гэтая далікатная кветачка плакала б тут ад адчаю; мабыць, сядзела б пад дрэвам, схаваўшы твар у каленях, і не магла б спыніць слёзы, ахопленая жудою непрагляднае ночы, нематы ды адзіноты.

— Ты — анёл? — спытала дзяўчына.

— Так, я анёл, — мякка адказаў Ніко; ягоны голас крыху дрыжаў ад усведамлення адказнасці, ускладзенай на яго казачную місію, — я анёл! І я прыляцеў, каб выратаваць цябе! Цяпер я з табою! Ты можаш больш нічога не баяцца!

— Добра, — пагадзілася дзяўчына.

Яна з палёгкаю ўздыхнула ды нарэшце дазволіла сабе ўсміхнуцца — і нібыта залатыя жарынкі пырснулі ў бакі ад гэтай усмешкі, на секунду заблыталіся ў лясным галлі ды згаслі, пакінуўшы па сабе ледзь чутныя ноты няўлоўных мелодый.

Яны ўсё яшчэ стаялі, пераплёўшы далоні, і не маглі адвесці вачэй адно ад аднаго.

— Якая ты прыгожая! — замілавана вымавіў Ніко, сузіраючы шляхетныя рысы звернутага да яго твару.

— Які ты прыгожы! — рэхам адгукнулася дзяўчына.

— Не, — мякка запярэчыў Ніко, — гэта ты — прыгожая! Ніхто не можа быць прыгажэйшай за цябе! Ты — як зорка! Як зорачка з неба! Ты — самая прыгожая ў гэтым свеце! Дарэчы, — падхапіўся ён, — нам ужо час ляцець!

— І мы папраўдзе паляцім? — у шчаслівым захапленні спытала «зорачка».

— Так! — запэўніў яе Ніко. — Мы паляцім, і я аднясу цябе дахаты. Я буду трымаць цябе моцна-моцна, ты можаш нічога не баяцца! Мы падымемся ў гэтае неба, і ты ўбачыш, што такое Шчасце!

Ніко так рашуча запэўніваў яе ў бяспецы палёту, нібы не ён сёння ўранні, у хаце Бабы Ягі, не ведаў, як паварушыць крыламі.

— Гатовая? — спытаў ён у будучай каралеўны. — Паляцелі!

Ніко абняў яе аберуч ды моцна прыціснуў да сябе. І ўмомант елкі апынуліся пад нагамі. У небе, бяздонным ды казачным, ляніва пазяхнула, зірнуўшы на іх, вялікая белая поўня.

Яны ляцелі. Ніко, сціскаючы сваю прыгажуню, адчуваў, як калоціцца яе сэрца. Дзяўчына замружыла вочы ды схавалася тварам у ягоным плячы.

— Не бойся! — падбадзёрыў яе Ніко. — Паглядзі, як прыгожа!

Дзяўчына паслухмяна павярнула галаву ды паглядзела навокал. Унізе ляжаў бясконцы лес, той, дзе яна яшчэ хвіліну таму блукала зусім адна. А ўверсе — чорнае неба. І калі б нехта шукаў прыгажосці ў гэтай бясконцай цемрадзі, ён заўважыў бы толькі іх: анёла і дзяўчыну з залатой залеваю валасоў.

І раптам далікатная прыгажуня рашуча прамовіла, паказаўшы рукою долу:

— Я жыву тут!

Ніко зірнуў уніз. «Тут» ніякага каралеўскага замка не было. Затое было возера — вялікае цёмнае лясное возера, як тыя, што маляваў у мроях Ніко, уяўляючы сваіх залатых цмокаў.

Ніко асцярожна апусціўся на халаднаваты пясок ды ўгледзеў непрыкметны з вышыні маленькі домік, што стаяў ледзь не на самым беразе блізка ля вады.

— Вось тут я і жыву, — усміхнулася дзяўчына, якую ён ужо выпусціў са сваіх абдымкаў.

— Дабранач! — сказаў Ніко, не атрымаўшы запрашэння на якую-небудзь гарбату, але, убачыўшы, што дзяўчына не сыходзіць, задаў даволі лагічнае пытанне:

— Прыгажуня мая, а як цябе завуць?

— Ніні! — працягвала пяшчотна ўсміхацца таямнічая знаходка.

— Ніні... — паўтарыў ён. — А я — Ніко! Анёл Ніко. Ну, я паляцеў? Але заўтра вярнуся! Я абавязкова вярнуся, толькі чакай мяне!

І ўсяго толькі трэці раз за сённяшні дзень ён адарваўся ад зямлі ды памкнуўся ў неба, пакінуўшы на беразе возера дзяўчыну. Ён ужо не бачыў, як тая, прыклаўшы пальцы да вуснаў ды праводзячы яго позіркам, некалькі разоў прашаптала:

— Ніко... Ніко...

А Ніко, рукі ды плечы якога яшчэ захоўвалі дзявочае цяпло, ляцеў сабе ды разважаў. Ён уцяміў, што забыўся высветліць у Бабы Ягі даволі значнае пытанне: а дзе ж ён цяпер мусіць жыць? Не ў лесе ж яму начаваць!

Ён ляцеў ды тужліва думаў пра які-небудзь домік, маленькі светлы домік на вершаліне якой-небудзь гары. І ўрэшце казачны досвед зрабіў сваю справу.

— Дом! — здагадаўся вымавіць Ніко. — Я лячу дахаты!

І амаль адразу поўня акрэсліла ў небе абрысы высокіх гор, да якіх з радасцю памкнуўся Ніко; і неўзабаве ён натрапіў на сваё анёльскае жытло. Гэта быў дом, які, нібы гняздо вялікіх птушак, месціўся на адной з горных вяршыняў, годна высокіх ды недасяжных. Ніко ўляцеў у дзверы свайго дома ды, не запальваючы святла, паваліўся на ложак і заснуў бестурботным казачным сном.

Раніца ўвайшла ў ягоны дом разам з аблокамі. Ніко расплюшчыў вочы ды, знайшоўшы сябе высока ў небе, у белых пульхных аблоках, зноў адчуў шалёную радасць.

Ён ускочыў, зажмурыўся, пацягнуўся і выпрастаў крылы.

— Вось што такое шчасце!

Пачалося ягонае сапраўднае казачнае жыццё. Цяпер ён меў сваю ролю — і няблага пачаў яе выконваць; ён валодаў уласным жытлом, пра якое марыў! Домік насамрэч аказаўся лепшым, чым Ніко сабе ўяўляў: вокны, якія можна было адчыняць насцеж ды дазваляць аблокам праплываць праз пакой, а сам пакой быў белы, нічым не загрувашчаны; сапраўднае анёльскае жытло. Ніко агледзеў панараму ды застаўся задаволеным: гара была высачэзная, ускараскацца на яе было немагчыма, хіба што ўзляцець; унізе, наколькі ставала погляду, ляжаў усё той самы лес, і далягляд быў зацягнуты фіялетавым туманам. «Ну проста цэнтар Сусвету!» — самазадаволена пастанавіў нанованавернуты анёл.

Ніко згадаў наказ Бабы Ягі быць шчырым ды, каб выканаць сваё абяцанне, паляцеў да Ніні. Яго крыху расчаравала тое, што яна не была каралеўскаю дачкою, але што зробіш: анёл мусіць выратоўваць усіх, а не выпытваць у кожнай дзяўчыны яе радавод.

Ніні сядзела на беразе, калі ён прыляцеў, ды шпурляла каменьчыкі ў ваду, сузіраючы маленькія хвалі. Выгляд яна мела даволі журботны. Ніко апусціўся на пясок побач з ёю.

— Давай, можа, пазнаёмімся? — прапанаваў ён. — Ты хто? Чым ты займаешся?

— Ну... — Ніні шпурлянула чарговы каменьчык, і хвалі зноў пабеглі па паверхні возера. — Цікавае пытанне... Складанае. Хто я... Я, ты ведаеш, сама ўсё жыццё спрабую знайсці адказ. А хто, дарэчы, мае вырашаць? Для гэтага каменьчыка я — сусветная катастрофа. Для птушак — тая, хто іх корміць. А аблокам я ўвогуле ніхто! А для сябе самой... не ведаю!

Ніко, паклаўшы галаву на калені, уважліва слухаў Ніні, спрабуючы сцяміць, што яна мае на ўвазе. Але ў яго кепска выходзіла. Што тут складанага: адказаць, хто ты? Тут, у казцы, усе ролі размеркаваны. Калі ты ніхто, так і кажы, навошта будаваць вежы са слоў?

Ніні працягвала.

— Што тычыцца таго, чым я займаюся... О, заняткаў у мяне багата! Кідаць каменьчыкі ў ваду — раз! Карміць птушак — два! Размаўляць з лесам — тры!

Яшчэ можна глядзець у неба — о, усё жыццё можна пакласці на сузіранне неба! Яно, ведаеш, ніколі не бывае аднолькавым. Не бывае двух падобных світанкаў. А калі навальніца? А калі вясёлка? Тут такое можна пабачыць! Яшчэ я люблю словы. Люблю з імі гуляцца. Складаць іх у сказы... Для мяне сказ, ведаеш, — як музыка! Ты ніколі не думаў, што такое слова? Чаму ў ім хаваецца сэнс? Дзе ён там прыхаваны, за якой літарай? Калі словы растрэсці на літары — сэнс траціцца. Літара не мае сэнсу, а слова мае — чаму? Я люблю слухаць. Дождж, напрыклад, ці вецер... А ты — хто? — яна нечакана, як мячык у дзіцячай гульні, кінула пытанне Ніко.

Той спешна пачаў шукаць словы, каб не пакрыўдзіць Ніні, каб выпадкова не сказаць, што ягоная місія куды больш значная за ейную.

— Я... А я проста анёл. Я лётаю, каб людзі мяне прыкмячалі ды радаваліся. А, вось яшчэ, — тут Ніко раптам згадаў маленькую зацемку Бабы Ягі пра ягоныя магчымасці ды вырашыў скарыстаць іх напоўніцу, — я — анёл-абаронца! Хочаш, я буду тваім анёлам-абаронцам? Ведаеш, што гэта такое?

— Патлумач! — папрасіла Ніні.

І Ніко пачаў выдумляць. Бо Яга сама нічога не патлумачыла яму, а ўважліва прачытаць энцыклапедыю ён не здагадаўся.

— Ну, анёл-абаронца — гэта такі анёл, які абірае каго-небудзь ды абараняе яго... Ад усяго! Ад розных небяспек. Ён заўсёды нябачна прысутнічае ля таго, каго абараняе. Вось, напрыклад, сядзіш ты дома адна, а за акном ноч, а табе самотна, плакаць хочацца, і нікога побач няма... І тут ты згадваеш, што маеш анёла-абаронцу — і табе адразу робіцца весела ды несамотна. Ці вось ідзеш ты адна па лесе, і табе боязна... А насамрэч нічога не трэба баяцца, бо ты пад маёй абаронай! І ты адразу адчуеш, як ветрык пяшчотна кранаецца твайго твару — а гэта насамрэч я, твой анёл-абаронца! Я заўсёды буду з табою!

— Так... Я згодная! — заўсміхалася Ніні.

Яна зноўку глядзела на Ніко сваім даверлівым позіркам, гэтаксама, як глядзела тады ў лесе.

«Прыгожыя ў яе вочы, — адзначыў Ніко, — толькі сумныя занадта!»

— Ты не сумуй! — паспрабаваў пераканаць ён Ніні. — Трэба заўсёды захоўваць усмешку! Мы жывём у казцы! Вось я заўжды шчаслівы! Ну чаму ты такая сумная?

— Я не сумная, — сказала Ніні ды зноў перастала ўсміхацца, — у мяне такі выраз твару.

— Ну, цяпер ты можаш усміхацца часцей — у цябе ёсць я! — Ніко падняўся, каб ляцець. — Даруй, ужо час развітацца! У мяне багата-багата спраў. Анёлам быць, ведаеш, адказна вельмі!

Здавалася, немагчыма ўявіць Ніні больш сумнай, чым яна была, але пасля апошніх слоў Ніко ў ейных вачах нібы задзьмулі свечкі, і яны зрабіліся цёмнымі-цёмнымі.

— Ляці, мой анёл!

— Я прылячу! Чакай! — пракрычаў Ніко з вышыні.

Папраўдзе кажучы, ніякіх тэрміновых справаў Ніко не меў. Ён толькі збіраўся іх сабе напрыдумваць. Пільнаванне цмокаў ён адклаў на няпэўны тэрмін, вырашыўшы спачатку даследаваць казку, у якой жыў усяго толькі другі дзень, але ўжо паспеў абчапляцца адказнасцямі ды абавязкамі.

І пачаліся ягоныя бясконцыя палёты невядома куды з неакрэсленаю мэтай. «Вось ужо дакладна, — пасміхаўся з сябе самога Ніко, — ляці туды, не ведаю куды, знайдзі нешта, не ведаю што! Вось гэта казка, я разумею!»

Спачатку лес паўстаў перад ім вялікаю таямніцаю. Лес — Ніко не ведаў яго назвы — пэўна, быў жывы. Ну, калі не жывы, дык спрэс заселены жывымі істотамі.

Ніко, лётаючы над елкамі, заўважаў унізе няпэўны рух, прысутнасць жыцця; але гэтае жыццё хавалася ад яго. Або не хавалася — проста не мела патрэбы ў ягоным анёльскім удзеле. Ніко здагадваўся, што, каб бліжэй пазнаёміцца з ляснымі насельнікамі, трэба апусціцца на зямлю ды пачаць жыць паводле законаў лесу, а не лётаць над галовамі белай зданню, чапляючы нагамі елкі. Але гэта мусіла адабраць багата часу, а Ніко хацеў ведаць казачную геаграфію, хаця б у агульных рысах.

Таму ён падымаўся ўгару ды ляцеў высока над лесам, спрабуючы дасягнуць ягоных межаў.

Гэта таксама было цяжка. Колькі разоў Ніко марна намагаўся даляцець да краю лесу, і шторазу ён прылятаў дахаты, змораны ўшчэнт, так нічога і не спазнаўшы. Ніні, да якой ён раз-пораз завітваў, не магла нічога патлумачыць. І толькі пад канец другога тыдня Ніко змяніў тактыку. Адной раніцай, вылятаючы са свайго доміка на гары, ён рэзка набраў вышыню, але не спусціўся, як раней. І амаль адразу пабачыў вынікі.

Планета скранулася з месца ды пачала павольна пракручвацца пад ягонымі крыламі. Бясконцы лес, раней нерухомы, нібы падаўся назад, і сонца яшчэ не паспела падняцца ў зеніт, калі Ніко ўпершыню ў сваім казачным жыцці пабачыў мора.

Ніко адразу здагадаўся, што бліскучая рыса на даляглядзе — гэта і ёсць мора, такой свабодай пацягнула адтуль. І вецер неўпрыкмет перамяніўся, падзьмуў нечым свежым ды салёным.

— Мора! — крычаў Ніко. — Мора!

Здаецца, якая розніца была яму, здольнаму лётаць, над морам ляцець ці над лесам? Ніко і сам не ведаў, чаму ён апанаваны гэткім радасным шалам, заўважаючы ўнізе ваду заміж дрэў. Але мора таксама было жывое. Ягонае салёнае вадкае цела няспынна калыхалася; хвалі лавілі сонца і мелі намер асляпіць Ніко сваім ззяннем, але адно дадавалі яму шчасця. А як можна адчуваць сябе няшчасным, калі ты імчыш над морам, не маючы іншага клопату, як толькі супрацьстаяць салёным пругкім вятрам? Як можна не крычаць ад шчасця, калі барвовае сонца хіліцца да далягляду, а пад табою апантана палымнеюць марскія хвалі, і ты ляціш да гэтага чырвонага сонца над палымнеючым морам, абсалютна вольны, — што гэта, калі не шчасце?

Ніко быў шчаслівы. Ён усіх хацеў зрабіць шчаслівымі. Калі на даляглядзе з'яўляліся ветразі, ён набліжаўся да карабля на такую адлегласць, каб быць пабачаным. І яго заўважалі з карабля — Ніко здавалася, што ён чуе крыкі матросаў: «Анёл! Анёл! Глядзіце, анёл у небе!»

Ніко ніколі не задаваўся пытаннем, чаму людзі лічаць за шчасце пабачыць у небе анёла. Што можа быць у ягоным з'яўленні цудоўнага, асабліва для казачных жыхароў? Ён жа не сыпаў ім грошай з неба, не падымаў іх у нябёсы. Не, ён проста ляцеў, шчаслівы анёл, і дзяліўся сваім шчасцем з усімі.

Людзі таксама не дапытваліся крыніцаў свайго шчасця. Проста так было заведзена ў казцы: пабачыць анёла — гэта добры знак. Мабыць, заўсёды толькі вера ў цуды робіць людзей шчаслівымі.

Ніко не спыняў сваіх далёкіх палётаў. Ён працягваў адкрываць новыя даляглядзы, і кожны дзень прыносіў яму нешта дагэтуль неспазнанае. Ніко ўрэшце натрапіў на вялікія гарады; толькі за адзін дзень ён налічыў іх пяць. Гарады таксама трэба было вывучаць.

Гэта былі такія гарады, якія мусяць быць у казках. Калі б Ніко не забыўся на сваю гістарычную адукацыю, ён занёс бы іх у Сярэднявечча, у Заходнюю Еўропу. Вузкія брукаваныя вулкі, мураваныя трохпавярховыя дамы, дахі, крытыя чырвонай, сцямнелай ад часу дахоўкай, замак або палац у цэнтры, аточаны высокім мурам, і

спічастыя вежы ратуш ды сабораў — такія вось маленькія, падобныя адно да аднаго, гарады. І жанчыны там апраналіся ў доўгія прыгожыя сукенкі, і мужчыны мелі годны выгляд, і вясёлыя дзеці выдавалі на маленькіх анёлаў. Гарады таксама існавалі паводле нейкіх законаў, і чалавечы рух быў там унармаваны: людзі збіраліся на пляцах, каб слухаць прамоўцу або цешыцца з тэатральнай дзеі, хадзілі на рынак выменьваць рэчы на ежу або наадварот, займаліся кожны сваёй справай — карацей, у казачных гарадах кожны жыхар таксама меў вызначаную ролю.

Ніко меў здагадкі, што гарады ў казцы існуюць не проста так, што жыхары ўдзельнічаюць у агульнай дзеі, трапляюць у розныя прыгоды, маюць таямнічыя місіі, але гарадское жыццё ніяк не тычылася Ніко. Гарады мелі свае таямніцы — і не спяшаліся адкрываць іх чужынцу. Але Ніко не кідаў спроб асэнсаваць казку, ён трапляўся людзям на вочы — і штораз яны ўздымалі твары ды, шчаслівыя, крычалі:

— Глядзіце, анёл! Вунь анёл праляцеў!

Нешта няўцямнае ўтрымлівала Ніко ад таго, каб узяць ды папросту апусціцца на якім-небудзь пляцы. Ён ужо даволі доўга існаваў у казцы ды інтуітыўна разумеў, што яму дазволена, а што — забаронена. Ну апусціцца ён на плошчы — і што далей? Што ён мае паведаміць людзям? Расказаць, як добра лятаць над морам? Або як прыемна жыць у белым доме на вяршыні высокай гары? Э-э-э-э… У тым і справа, што нічога ён не меў сказаць людзям. Толькі лятаць над іхнімі галовамі, абяцаючы блізкія цуды.

Два ці тры разы Ніко, прычакаўшы глыбокае ночы, спускаўся ды блукаў па горадзе, вывучаючы вулкі, мінаючы апусцелыя пляцы, але вельмі хутка знікаў, ледзь пачуўшы крокі выпадковага начнога мінака.

Лес, мора, гарады — усё было таямнічае, загадкавае, недаступнае, і Ніко ламаў галаву, шукаючы сэнс у гэтай казачнай дзеі. Дык у чым, у чым палягае ягоная місія? Дзе чакаюць яго гераічныя ўчынкі? Які ўвогуле сэнс мае гэтая казка? Ці ёсць у яе пачатак? Ці мае яна канец? І якое morality напісана на апошняй старонцы?

Ніко пачынаў дашуквацца сэнсу — і кідаў гэты марны занятак. Мабыць, сэнс казкі — быць шчаслівым? Нешта забагата шчасця было прызначана на аднаго маленькага анёла!

Ніко шукаў новых знаёмстваў. Так аднойчы ён ледзь не знайшоў бяду на сваю галаву.

Аднаго разу ён пралятаў марскім узбярэжжам ды, заўважыўшы на даляглядзе замак, нядоўга думаючы скіраваўся туды. Яго яшчэ не пакідала надзея напаткаць прыгожую каралеўскую дачку.

Зблізу замак аказаўся вельмі змрочным, нібы ахутаны чорнаю хмараю, але Ніко ўжо падлятаў да замкавых вежаў і не хацеў вяртацца, нічога не разведаўшы. Ён наблізіўся да акна ды стаў у прагале, зазіраючы ўсярэдзіну.

Калі ягоныя вочы прызвычаіліся да паўзмроку, Ніко ўцяміў, што глядзіць у вялізную залу, такую гіганцкую, што стол ды крэсла ўнізе выдавалі на лялечныя. У зале быў камін памерам з мескую браму, а ў фатэлі сядзеў хударлявы мужчына ды ўважліва сузіраў анёльскую постаць, якая нечакана з'явілася ў акне. Чалавек маўчаў, чакаючы першага слова ад нябеснага госця.

Ніко не знайшоў нічога лепшага, як асцярожна, але як мага больш ветліва вымавіць: «Дзень добры!»

Змрочны мужчына, аднак, яшчэ крыху счакаў, нібы падбіраў словы, але ўрэшце сказаў:

— Ну добры дык добры… Спускайся да мяне, калі ўжо прыляцеў… анёлак!